## Славамір Адамовіч

# Варты самога сябе

«Столькі намаганьняў пакладзена і дарагога апазыцыйнага часу страчана дзеля стварэньня вобразу Быкава-рэзыстанта, а ён узяў ды памёр», — падумаў я, атрымаўшы сумную навіну ад знаёмага беларускага палітуцекача, які знайшоў часовы прытулак у Фінляндыі.

На другі дзень, чытаючы ў Інтэрнэце камэнтары на сьмерць пісьменьніка, я раптам пачуў, як нехта ўва мне злосна прашыпеў: «Пасьля цяжкой і працяглай хваробы... апазыцыя панесла непапраўную страту». «Да-да», — кіўнуў мне сярэдняга веку аўганец, які разы тры спрабаваў пераходзіць беларускую дзяржаўную мяжу ў раёне Смаргонскага пагранатраду і крыху разумеў па-славянску.

На трэці дзень чорны гумар ува мне пачаў ператварацца ў зялёныя пэстыцыды сарказму, і я ня мог не падумаць: «Вось яшчэ адзін літаратурны «зубр» пакінуў нас, а правільныя гарадзкія хлапцы пакуль так і не перамаглі калхозных рыштантаў-лімітчыкаў...»

На чацьвёрты дзень я пасьпяшаўся вярнуцца да праблемаў уласнага існаваньня: паходаў у горы, вывучэньня бежанскага інтэрнацыяналу, пошукаў жанчыны, пісаньня дзёньнікаў, вершаў і пісьмаў у каралеўскую рэзыдэнцыю... Аднак сёньня, атрымаўшы прывітаньне з «Arche», я зноў мусіў вярнуцца да пытаньня пра сьмерць вялікіх.

Васіль Быкаў, як ніхто іншы зь пісьменьнікаў яго веку, мужна абараняў сваю Матку-нацыю ад залётнага кабяля-парнографа. Гэта факт. Але факт і тое, што ягонае публічнае стаяньне за Беларусь суправаджалася нязьменным пэсымістычным одумам. Ці не савецкае мінулае ўтрымлівала яго ад патрыя-

тычнай гарачкі апошніх гадоў?

У дыскусіі пра вялікага Быкава трэба ясна бачыць абодва бакі мэдаля. На адным Васіль Уладзіміравіч засядае ў прэзыдыюме зьезду БНФ, крочыць у першых шэрагах дэманстрантаў і дае інтэрвію лібэральным СМІ. На другім ён — звычайны савецкі пісьменьнік, які крыху больш за іншых сказаў пра акопную праўду *савецкай* вайны.

Калі Быкаў сапраўды назваў салжаніцынскі «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» «каляднай казачкай», то мне такі ягоны пасаж нагадвае заяву Зянона Пазьняка ўзору 96-га наконт таго, ці варта палітыку ісьці на турэмную адседку. Больш за тое, у апошні час Быкаў сам пачаў пісаць казачкі-прыпавесьці. Але — позна: пісаць іх трэба было крыху раней, хоць бы ў 80-я...

Васіль Быкаў — ня *мой* пісьменьнік (мае — Гарэцкі, Чорны, Колас, Яновіч), тым ня менш, дзякуй яму за тое, што ён не баяўся запэцкацца і мяшаўся ў палітыку.

Быкаў пайшоў. На перадавой зацішша. Вэрбальную зброю павінны ўзяць пакаленьне саракагадовых і маладзейшыя. Вось толькі цікава, як адрэагуе дэмакратычная грамадзкасьць, калі заўтра стане вядома, што атаку на варожае пасольства арганізаваў... беларускі літаратар?

*1 жніўня 2003 году,*

*Паўночная Нарвэгія*